# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

*Да 75-годдзя з дня нараджэння доктара культуралогіі А. І. Смоліка*

УДК 008-027.21

*В. М. Сакалова*

## Гістарычны вобраз: мадэлі інтэрпрэтацыі ў камемаратыўным дыскурсе



*Разглядаецца памяць аб творцах культуры, выяўленая ў біяграфічных наратывах, як культурная практыка звяртання да былога. Гістарычныя вобразы падаюцца ў якасці сродкаў дэшыфрацыі сацыякультурнай прасторы мінулага і асэнсавання нацыянальнай ідэнтычнасці сучаснага беларускага грамадства.*

У сучасным свеце культура знаходзіцца ў стане асэнсавання новых каштоўнасцей, ідэй і перакананняў, ва ўмовах трансфармацыі ці ўвогуле адсутнасці былых дамінант. У такіх абставінах выражэнне нацыянальнай культурнай ідэнтычнасці, якая сёння знаходзіцца пад уздзеяннем глабалізацыі, транзіцыі і спажывання, залежыць ад падзей, змен і канфліктаў, абумоўленых урбанізацыяй, міграцыяй і іншымі палітыка-эканамічнымі і культурнымі працэсамі, становіцца ўсё больш актуальным. У гэтых працэсах паняцці памяці, культуры камемарацыі займаюць ключавыя пазіцыі. Памяць прадвызначае культурную дынаміку, таму ўзбагачэнне даследаванняў у галіне мемарыялізацыі, у тым ліку праз стварэнне наратываў пра мінулае, уключэнне іх у актуальны кантэкст, – адна з асноўных задач гуманітарыстыкі. Стварэнне новага тэксту пра культуру мінулага задзейнічае актуалізаваную памяць, калі адбываецца ўзаемадзеянне «сёння» і «ўчора», мінулае ўваходзіць у сучаснасць.

Увядзенне мінулага ў сучасную культуру пры дапамозе рэканструкцыі жыцця айчынных славутых дзеячаў – важнейшы сродак супрацьстаяння забыццю, захаванню нацыянальнай ідэнтычнасці. Біяграфічны наратыў, у аснове якога ляжыць міф, дапамагае прасачыць зараджэнне і распаўсюджванне дасягненняў культуры. Міфалагізацыя – культурны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

механізм, які яскрава ўвасабляецца ў біяграфіі. Асноўнай метадалагічнай стратэгіяй пры гэтым з'яўляецца герменеўтыка як стратэгія даследавання светапогляду асобных суб'ектаў культуры. Нагадаем, што тэрмін «герменеўтыка» М. Хайдэгер выкарыстоўваў у сферы аналізу быцця асобы, сэнс якога можна выяўляць і тлумачыць падобна тэксту [33, S. 338].

Рэканструкцыя і інтэрпрэтацыя гістарычных вобразаў, іх аналіз і дэшыфроўка знаходзяцца ў цэнтры ўвагі доктара культуралогіі, прафесара, загадчыка кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў А. І. Смоліка.

Заснавальнік школы беларускай культуралогіі Аляксандр Іванавіч Смолік вядомы як актыўны папулярызатар культуралагічных ведаў і педагог, адзін з вядучых спецыялістаў па праблемах выяўлення, актуалізацыі і захавання нацыянальнай спадчыны, зрабіў значны ўнёсак у айчынную культуралогію. Ён упершыню даследаваў гісторыю беларускай культуралагічнай думкі, а таксама вывучыў і апісаў маловядомыя аспекты жыцця і дзейнасці творчых асоб у цыкле артыкулаў аўтарскай рубрыкі «Славутыя суайчыннікі» праекта «Студыя культуры і прыгажосці», якія публікаваліся ў часопісе «Народная асвета» на працягу 2012–2019 гг. [4–9; 11; 13–24; 26; 27].

Шмат гадоў у архівах розных краін апантаны вучоны шукае звесткі пра беларусаў, якія ўнеслі важкі ўклад у навуку і культуру айчыны і замежных краін. Са старонак часопіса «Народная асвета» ён распавядае пра творчую спадчыну і жыццёвы лёс прадстаўнікоў беларускай культурнай прасторы: Саламеі Русецкай, Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў, Іосіфа Гашкевіча, Адольфа Янушкевіча, Эміліі Плятэр, Міхаіла Гузікава, Бенядзікта Дыбоўскага, Напалеона Орды, Камілы Асіповіч, Надзеі Лежэ і інш. Перад дапытлівым чытачом паўстае галерэя партрэтаў гістарычных асоб, якую стварае А. І. Смолік, адкрываючы сучаснікам забытыя імёны.

У фокусе даследавання аказваюцца рэканструкцыя жыцця асобы (асабліва значная пры мізэрнасці фактычнага матэрыялу), яе духоўнага свету, гісторыя самастварэння, ідэйнай эвалюцыі, якія маюць перадумовай біяграфічны, тэкстуальны, сацыякультурны аналіз. Вывучаюцца аспекты перакананняў, фарміраванне поглядаў у сувязі з грамадскай думкай на фоне гістарычных і палітычных падзей. Праз жыццеапісанне індывіда адбываецца трансляцыя ідэй пэўнай эпохі, перадача культурных сэнсаў. Любоў да бацькаўшчыны, яе гісторыі і культуры разглядаецца як дамінуючы фактар у адлюстраванні светапогляду гістарычнай асобы. Чалавек у кантэксце гісторыі, яго творчы лёс і штодзённае жыццё, адносіны да падзей і настрояў эпохі – усё гэта шчыра цікавіць даследчыка, дае падставы для шырокіх абагульненняў.

На працягу дзесяцігоддзя вучоны даследуе культурна-асветніцкую дзейнасць, традыцыі славутага старажытнага беларускага роду



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тышкевічаў [3; 13; 15]. Заснавальнікам беларускай археалогіі, гісторыкам, этнографам, стваральнікам першага нацыянальнага музея старажытнасцей – братам Канстанціну і Яўстафію Тышкевічам прысвечана канферэнцыя «Тышкевіцкія чытанні», якая ладзіцца з 2008 г. па ініцыятыве А. І. Смоліка. У 2014 г. традыцыйная імпрэза набыла статус міжнароднай. Арганізаваныя прафесарам Пятыя Тышкевіцкія чытанні прайшлі ў рамках зацікаўленага дыялогу літоўскіх і беларускіх вучоных ў Палацы Тышкевічаў (г. Крэцінга, Літва) [3].

Роля і ўплыў жанчын на развіццё грамадскага і прыватнага жыцця ў XVIII ст. разглядаецца даследчыкам на прыкладзе незвычайнага лёсу лекаркі Саламеі Рэгіны Русецкай [24]. Паглыблены ў культурна-гістарычны матэрыял А. І. Смолік вывучае музычную і асветніцкую дзейнасць музыканта-вынаходніка са Шклова Міхаіла Гузікава, таленавітай піяністкі, настаўніцы, удзельніцы нацыянальна-вызваленчага руху Камілы Асіповіч, дачкі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча [17; 19]. Навукова-асветніцкая і грамадская дзейнасць паэта, перакладчыка, этнографа Адольфа Янушкевіча, яго ўнёсак у беларускую, казахскую, польскую і ўкраінскую культуры падаецца даследчыкам як узор духоўнасці, самаахвярнасці, патрыятызму [5]. А. І. Смолік адзначае надзвычайную каштоўнасць для гісторыі нацыянальнай архітэктуры выяўленчай спадчыны мастака Напалеона Орды, па шматлікіх малюнках беларускіх храмаў, сядзіб, паркаў, замкаў і палацаў якога сёння можна ўзнавіць, альбо, на жаль, толькі ўявіць аўтэнтычны выгляд страчанага [21].

Найбольш значнай навуковай працай А. І. Смоліка ў галіне гістарычнай персаналогіі стала манаграфія «Божы дар Івана Кандрацьева», выдадзеная ў 2013 г. у заснаванай прафесарам серыі «Культурны імідж Беларусі» [12]. У фундаментальнай працы ўпершыню ўводзіцца ў навуковы абыходак імя паэта, празаіка, перакладчыка, краязнаўцы, аўтара шырокавядомых песень «По диким степям Забайкалья», «Очаровательные глазки», драматурга другой паловы XIX ст. Івана Казіміравіча Кандрацьева. Даследчык яго незвычайнага творчага лёсу А. І. Смолік нарадзіўся праз сто гадоў у той самай вёсцы Каловічы на Вілейшчыне, што і пісьменнік. (На малой Радзіме пісьменніка па ініцыятыве Аляксандра Іванавіча ў 2013 г. ажыццёўлены Кандрацьеўскія чытанні [29] і адкрыты помнік слыннаму творцу.)

У рэцэнзіі на манаграфію адзначаны шырокая крыніцазнаўчая база, шматаспектны падыход да тэмы, спалучэнне культуралагічнага аналізу творчай спадчыны славутага дзеяча з персаналістычным падыходам. Асобую значнасць, як падкрэсліваецца ў рэцэнзіі, мае асэнсаванне сацыякультурнага фону эпохі, што дапамагае панарамнаму ўспрыманню часу [28]. Пры дапамозе дэшыфроўкі біяграфій асоб адбываецца дэшыфраванне сацыякультурнай прасторы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У манаграфіі «Беларуская культуралогія: гісторыя і сучаснасць» у кантэксце станаўлення імпліцытных і эксплiцытных культуралагічных ведаў аб дынаміцы культурных працэсаў пададзены персаналіі беларускіх вучоных (ад Сярэдневякоўя да першых дзесяцігоддзяў XXI ст.), якія прысвяцілі навуковае жыццё фундаментальным і прыкладным праблемам нацыянальнай культуры [10].

Значнасць мастацкай творчай спадчыны суб'ектаў беларускай культуры, фарміравання і развіцця нацыянальнага прафесійнага мастацтва грунтоўна паказана ў манаграфіі «Художественная культура Беларуси XVIII – 1-й четверти XX в.» [25].

Праблематыка ідэнтычнасці – прыярытэтны напрамак культуралагічных даследаванняў. Памяць культуры ў працэсе легітымацыі ідэнтычнасці выступае як сімвалічны рэсурс. Яна функцыянуе ў выглядзе вобразаў [1], якія арганізаваны ў дыскурсійныя мадэлі яе ўспрымання, разумення і ўсведамлення. Разглядаемыя асобы ў гісторыі культуры – наватары. Іх творчы шлях становіцца матэрыялам для выяўлення ўвасобленай у ім канцэпцыі памяці, якая ўплывае на структуру наратыву. Згодна з М. Хальбваксам, вобраз мінулага – гэта сацыякультурны канструкт [30]. А. І. Смолік стварае шматаспектныя біяграфіі – «наратывы з функцыяй легітымацыі» (Ж.-Ф. Ліатар [32]). Гэта не выпадковасць, а рэакцыя на асноватворныя праблемы сучаснага беларускага грамадства. Цікавасць даследчыка да культуры памяці – адказ на ўзрастаючую ўвагу да суб'ектыўнага боку пазнання. Права на памяць, права на сваю гісторыю, павага да спецыфічнага бачання мінулага – адны з базавых дэмакратычных каштоўнасцей.

Біяграфічны наратыў – важны спосаб узаемадзеяння з памяццю. Славутае мінулае з'яўляецца падмуркам да славутай будучыні. Агульны культурны механізм памяці, які ляжыць у аснове грамадскай практыкі [31], адкрывае для даследчыка магчымасць апраўданага супастаўлення і тыпалагічнага разгляду розных творчых асоб, стварэння вобразных шэрагаў нацыянальнай культурнай прасторы. Акрамя таго, вывучэнне прац А. І. Смоліка дазволіць удакладніць такія фундаментальныя тэарэтычныя паняцці, як «канцэпцыя асобы» і «гістарызм». Творчая памяць (рэфлексіўная, па фармуліроўцы П. Рыкёра [2, с. 22]) здольна не толькі ўзнаўляць мінулае, але і трансфармаваць, пераўтвараць яго.

У адным з артыкулаў Аляксандр Іванавіч прыводзіць словы Канстанціна Тышкевіча, якімі кіруецца па жыцці: «Кожны з нас, хто хоць колькі мае сілы, павінен для сваёй зямлі, для навукі ўнесці сваю долю» [13, с. 86]. І ён шчодра ўносіць, рыхтуючы новае пакаленне навукоўцаў, ладзячы канферэнцыі, ствараючы падручнікі і манаграфіі. Дыскурсіўныя мадэлі інтэрпрэтацыі гістарычных вобразаў у яго шматлікіх даследаваннях становяцца крыніцай для творчасці, а не адбіткам застылай памяці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Мазур, Л. Н.* Образ прошлого: формирование исторической памяти / Л. Н. Мазур // Извес. Урал. федерал. ун-та. Сер. 2, Гуманитарные науки. – 2013. – № 3 (117). – С. 243–256.

2. *Рикер, П.* Память, история, забвение / П. Рикер. – М. : Изд-во гуманит. лит., 2004. – 728 с.

3. Рэпрэзентацыя і музеефікацыя творчай спадчыны Тышкевічаў у Беларусі і Літве : Пятыя міжнар. Тышкевіцкія чытанні, Мінск, Крэцінга, 14–15 мая 2014 г. : манагр. зб. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; Kretingos muzejus grafų Tiśkeviču dvare. – Мінск : БДУКМ, 2014. – 183 с. : іл. – (Культурны імідж Беларусі).

4. *Сакалоўская, М. М.* Восіп Казлоўскі – педагог, кампазітар, «дырэктар музыкі» імператарскіх тэатраў / М. М. Сакалоўская, А. І. Смолік // Народная асвета. – 2015. – № 8. – С. 93–96.

5. *Смолік, А. І.* Адольф Янушкевіч: рэвалюцыянер, паэт, даследчык, асветнік / А. І. Смолік // Народная асвета. – 2013. – № 1. – С. 83–87.

6. *Смолік, А. І.* Аляксандр Семянтоўскі: этнограф, фальклярыст, археолаг / А. І. Смолік // Народная асвета. – 2015. – № 10. – С. 92–96.

7. *Смолік, А. І.* Антон Абрамовіч – кампазітар, этнамузыколаг, педагог / А. І. Смолік // Народная асвета. – 2015. – № 5. – С. 86–88.

8. *Смолік, А. І.* Ахілес Юзаф Банольдзі: спявак, фатограф, паўстанец / А. І. Смолік // Народная асвета. – 2016. – № 11. – С. 94–96.

9. *Смолік, А. І.* Барыс Кіт – беларускі настаўнік і амерыканскі вучоны / А. І. Смолік // Народная асвета. – 2018. – № 9. – С. 82–85.

10. *Смолік, А. І.* Беларуская культуралогія: гісторыя і сучаснасць / А. І. Смолік ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2014. – 276 с. – (Культурны імідж Беларусі).

11. *Смолік, А. І.* Бенядзікт Дыбоўскі: барацьбіт, вучоны, гуманіст / А. І. Смолік // Народная асвета. – 2017. – № 8. – С. 92–96.

12. *Смолік, А. І.* Божы дар Івана Кандрацьева / А. І. Смолік ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2013. – 260 с. – (Культурны імідж Беларусі).

13. *Смолік, А. І.* Граф Канстанцін Тышкевіч: вучоны, археолаг, краязнаўца / А. І. Смолік // Народная асвета. – 2013. – № 8. – С. 82–86.

14. *Смолік, А. І.* Граф Міхал Клеафас Агінскі – палітычны дзеяч, патрыёт, кампазітар / А. І. Смолік // Народная асвета. – 2015. – № 2. – С. 93–96.

15. *Смолік, А. І.* Графы Тышкевічы: род мецэнатаў, даследчыкаў, асветнікаў / А. І. Смолік // Народная асвета. – 2016. – № 6. – С. 91–96.

16. *Смолик, А. И.* Иосиф Гошкевич: просветитель, дипломат, ученый / А. И. Смолик, Масако Тацуми // Народная асвета. – 2012. – № 9. – С. 82–86.

17. *Смолік, А. І.* Каміла Асіповіч: музыкант, педагог, барацьбіт / А. І. Смолік // Народная асвета. – 2014. – № 10. – С. 81–85.

18. *Смолік, А. І.* Канстанцін Ельскі: змагар за свабоду, падарожнік, вучоны / А. І. Смолік, Л. К. Кухто // Народная асвета. – 2017. – № 3. – С. 93–96.

19. *Смолік, А. І.* Міхаіл-Іосіф Гузікаў: беларускія мелодыі ў музычнай сталіцы Еўропы / А. І. Смолік // Народная асвета. – 2014. – № 5. – С. 84–86.

20. *Смолік, А. І.* Надзея Лежэ: французскі лёс беларускай мастачкі / А. І. Смолік // Народная асвета. – 2019. – № 5. – С. 80–82.

21. *Смолік, А. І.* Напалеон Орда: кампазітар, мастак, патрыёт / А. І. Смолік // Народная асвета. – 2017. – № 10. – С. 81–84.

22. *Смолік, А. І.* «Пінскі след» у сусветным мастацтве / А. І. Смолік // Народная асвета. – 2018. – № 5. – С. 94–96.

23. *Смолік, А. І.* Платон Цясевіч: ад вёскі на Навагрудчыне да імператарскага тэатра / А. І. Смолік, М. М. Сакалоўская // Народная асвета. – 2016. – № 3. – С. 92–96.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

24. *Смолік, А. І.* Саламея Рэгіна Русецкая: лекарка, вандроўніца, феміністка / А. І. Смолік // Народная асвета. – 2014. – № 2. – С. 78–83.

25. *Смолик, А. И.* Художественная культура Беларуси XVIII – 1-й четверти XX в. / А. И. Смолик, М. М. Соколовская. – LAP, 2019. – 193 p.

26. *Смолік, А. І.* Чытанка для дзяцей І. К. Кандрацьева / А. І. Смолік // Народная асвета. – 2012. – № 8. – С. 87–92.

27. *Смолік, А. І.* Эмілія Плятэр: графіня, фалькларыстка, камандзір паўстанцаў / А. І. Смолік // Народная асвета. – 2016. – № 1. – С. 81–84.

28. *Сухоцкая, Т. Ф.* Талент, непадуладны часу / Т. Ф. Сухоцкая // Адукацыя і выхаванне. – 2013. – № 11. – С. 91–93. – Рэц. на кн.: Смолік, А. І. Божы дар Івана Кандрацьева / А. І. Смолік ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2013. – 260 с.

*29.* Талент, непадуладны часу : Кандрацьеўскія чытанні, Вілейка, май 2013 г. / пад навук. рэд. А. І. Смоліка ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2013. – 88 с.

30. *Хальбвакс, М.* Социальные рамки памяти / М. Хальбвакс ; пер. с фр. и вступ. ст. С. Н. Зенкина. – М. : Новое изд-во, 2007. – 348 с.

31. *Bloch, M.* Mémoire collective, tradition et coutume. A propos d'un livre récent / M. Bloch // Revue de synthèse historique XI, nouvelle série XIV. – 1925. – № 118–120. – P. 73–83.

32. *Lyotard, Jean-François.* La fonction narrative et la légitimation du savoir / Jean-François Lyotard // La Condition Postmoderne / Jean-François Lyotard. – Les Éditions de Minuit, 1979. – P. 49–53.

33. *Heidegger, M.* Sein und Zeit / M. Heidegger. – Tübingen : Niemeyer, 1963. – 437 S.

*V. Sakalova*

**Historical image: models of interpretation in commemorative discourse**

*The memory about the creators of culture, expressed in the biographical narratives, as a cultural practice of reference to the past is considered. Historical images as a means of decryption of socio-cultural space of the past and understanding of the national identity of the modern Belarusian society are presented.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 26.06.2019.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ